**І.М.Грамовіч,** *дацэнт*

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС ЯК СРОДАК СУЧАСНАГА ІНФАРМАЦЫЙНАГА СУПРАВАДЖЭННЯ ПАДРЫХТОЎКІ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ НА ФАКУЛЬТЭЦЕ МУЗЫЧНАГА МАСТАЦТВА

Вучэбны працэс у ВНУ можа паспяхова ажыццяўляцца толькі пры наяўнасці якаснага інфармацыйнага суправаджэння і навукова абгрунтаванага метадычнага забеспячэння. Працэс рэфармавання адукацыі і ўвядзенне новых адукацыйных стандартаў прывялі да патрэбнасці стварэння на факультэце музычнага мастацтва комплексу сучасных вучэбна-метадычных матэрыялаў і паставіў перад намі задачы надання працэсу падрыхтоўкі будучых спецыялістаў творчага і інавацыйнага характару.

Сістэмнае апісанне навучальнага працэсу павінна быць адлюстравана ў вучэбна-метадычных дакументах новага пакалення, якія атрымалі назву вучэбна-метадычных комплексаў (ВМК). Над распрацоўкай ВМК пастаянна працуе Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы, і ў якасці аўтарытэтных аўтараў адзначым А.В.Макарава, З.П.Трафімаву, В.С.Вязоўкіна, Д.Д.Зуева, Б.В.Цытовіч.

Асаблівае значэнне ВМК мае для забеспячэння самастойнай работы студэнтаў, а дакладней, такога яе віду, як кіруемая самастойная работа студэнтаў, тым больш што ў адпаведнасці з адукацыйнымі стандартамі новага пакалення самастойная работа выступае ў якасці нарматыўнага інтэграванага кампанента вучэбнага працэсу.

Вучэбна-метадычны комплекс – гэта ўзаемазвязаныя элементы, прызначаныя для арганізацыі выхавання і навучання ў мэтах дасягнення адпаведных вынікаў на аснове выкарыстання зваротнай сувязі, якая рэалізуецца ў працэсе праверкі якасці ведаў [1, с. 39].

Наяўнасць ВМК дапамагае вырашаць наступныя задачы ў навучанні:

– арганізаваць эфектыўнае вывучэнне дысцыпліны;
– матываваць самастойную работу студэнта;
– развіваць самастойнае мысленне навучэнцаў;
– садзейнічаць самарэалізацыі студэнтаў;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

– падтрымліваць і заахвочваць ініцыятыву студэнтаў па змяненні зместу заняткаў.

Структура ВМК вызначаецца:

– мэтамі, задачамі, узроўнем патрабаванняў адукацыйных стандартаў;

– забеспячэннем магчымасцей кіруемай самастойнай работы студэнтаў;

– асаблівасцямі вучэбнай дысцыпліны.

Вучэбна-метадычныя комплексы могуць быць праблемна-арыентаваныя, практыка-арыентаваныя, аглядныя, паняційна-тэрміналагічныя, міждысцыплінарныя, інтэграваныя, профільныя і інш. Мэта ВМК – забяспечыць прафесійнае станаўленне спецыяліста як самастойнай асобы з творчым стылем мыслення і высокім узроўнем навуковай кампетэнцыі.

Першую стадыю стварэння ВМК называюць эмпірычнай. На гэтай стадыі аўтар абапіраецца на свой вопыт і інтуіцыю. Наступная стадыя – тэарэтычная. На гэтым этапе пабудова кожнага дакумента падмацавана пэўнымі палажэннямі педагагічнай навукі. На трэцяй стадыі стварэння ВМК уводзяцца сродкі, ідэі і метады камп'ютэрызацыі, якія дазваляюць павысіць эфектыўнасць падрыхтоўкі кадраў.

Складанае і важнае пытанне – пабудова комплексу [3, с. 14].

Для чаго неабходна стварэнне ВМК? ВМК дазваляюць скараціць колькасць аўдыторных гадзін і павялічыць аб'ём гадзін на самастойную работу студэнтаў, рэалізаваць стандарты новага пакалення, якія арыентаваны на кампетэнтнасны падыход у навучанні, і, нарэшце, выкарыстаць інавацыйныя тэхналогіі ў навучанні.

Нам уяўляецца важным зварот да асобай сучаснай сістэмы навучання, якая знайшла распаўсюджанне ва ўсім свеце і ў Расіі, – модульнай. Гэта асноўная структурная адзінка ВМК. Вучэбны модуль ужываецца ў якасці сродку навучання і самастойнай работы студэнта. Тэорыя і практыка модульнага забеспячэння вельмі шырока асвятляюцца ў літаратуры, аднак патрэбна канкрэтызацыя іх для дысцыплін спецыялізацый факультэта музычнага мастацтва.

З дапамогай модульнага навучання рэалізуецца новы падыход да пабудовы зместу навучання, узаемасувязі выкладчыка і студэнта ў педагагічным працэсе, арганізацыі розных формаў і метадаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

навучання. Модуль ахоплівае ўвесь вучэбны матэрыял, а таксама ўсе формы вучэбнага працэсу: лекцыі, практычныя заняткі, семінары, практыкумы і інш.

Вучэбны модуль уяўляе адносна самастойную і цэласную адзінку працэсу навучання, што аб'ядноўвае мэты навучання, змест навучання часткі вучэбнага курса, яго тэхналагічнае забеспячэнне і метадычнае кіраванне, арганізацыйныя формы навучання, неабходныя для дыдактычнага працэсу, сістэму кантролю навучання.

За апошні час ва ўсіх навучальных установах рэспублікі склаліся пэўныя падыходы да стварэння ВМК. Факультэт музычнага мастацтва не выключэнне. Для забеспячэння якаснага выкладання вучэбнай дысцыпліны неабходны комплекс метадычных матэрыялаў: вучэбная праграма курса, вучэбны дапаможнік, хрэстаматыя, рэпертуарны дапаможнік, практыкумы, курс лекцый, пытанні да самастойнай работы, пытанні да практычных і семінарскіх заняткаў, тэставыя заданні і інш.

На сучасным этапе ёсць пэўныя вучэбна-метадычныя распрацоўкі, але гэта пакуль што толькі камплект вучэбна-метадычных матэрыялаў, складзеных у дапамогу студэнтам. Стварэнне ВМК вядзецца на падставе абагульнення вопыту выкладчыкаў, іх самастойных даследаванняў і распрацовак, гэта шэраг мерапрыемстваў, заснаваных на шматгадовай дзейнасці кафедраў, пераасэнсаванне педагагічнага вопыту. Менавіта таму на розных кафедрах па розных спецыялізацыях яны адлюстроўваюць сваю спецыфіку навучання.

На факультэце музычнага мастацтва пры выкладанні многіх курсаў выкарыстоўваецца блочна-модульная тэхналогія навучання. Гэтую тэхналогію складана выкарыстаць на індывідуальных занятках па харавым і аркестравым класах, дырыжыраванні, пастаноўцы голасу, вакальным і інструментальным ансамблях. Таму для названых дысцыплін патрабуецца своеасаблівая структура вучэбна-метадычных комплексаў. Але ў любых комплексах па розных прадметах вызначаецца ўзаемадзеянне мэт, зместу дыдактычных матэрыялаў і арганізацыйных формаў педагагічнага працэсу. У іх павінны быць вызначаны кірункі і заданні для самастойнай работы, якая б стымулявала творчае мысленне студэнтаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Распрацаваныя з улікам такіх патрабаванняў ВМК будуць адпавядаць развіваючаму навучанню ў вышэйшай школе. Значэнне іх узрастае, калі ў комплексах улічаны міжпрадметныя сувязі, што дазваляе пазбягаць дубліравання матэрыялу.

На сучасным этапе модульная арганізацыя вучэбнага працэсу па спецыяльных музычных дысцыплінах не атрымала дастатковай распрацоўкі ў літаратуры і тым больш рэалізацыі на практыцы. Наша задача – актывізаваць работу па стварэнні ВМК на факультэце музычнага мастацтва БДУ культуры і мастацтваў як аднаго са шляхоў інфармацыйнага суправаджэння падрыхтоўкі спецыялістаў.

---

1. *Дмитриев, Е.И.* Инновационный образовательный комплекс вуза: конспект лекций-презентаций / Е.И.Дмитриев. – Мн.: РИВШ, 2009. – 194 с.

2. *Иванов, А.* Современные учебно-методические комплексы нового поколения: состояние, проблемы, пути решения, перспективы / А.Иванов // Школа. – 1997. – № 2. – С. 54–58.

3. *Учебно-методический* комплекс: модульная технология разработки: учеб.-метод. пособие / А.В.Макаров [и др.]; под общ. ред. А.В.Макарова, З.П.Трофимовой. – 3-е изд., перераб. и доп. – Мн.: РИВШ, 2008. – 152 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ